
Літанія да бласлаўлёнага Яна Паўла II

Аўтар: Рэдакцыя
27.05.2011 03:00



Кірые, элейсон,
Хрыстэ, элейсон, Кірые, элейсон,
Хрыстэ, пачуй нас,
Хрыстэ, выслухай нас.

Ойча з неба, Божа,
– змілуйся над намі.
Сыне, Адкупіцель свету, Божа,
– змілуйся над намі.
Духу Святы, Божа,
– змілуйся над намі.
Святая Тройца, Адзіны Божа,
– змілуйся над намі.
Святая Марыя,
– маліся за нас.
Благаслаўлёны Ян Павел II,
– маліся за нас.
Заглыблены ў Айца, багатага на міласэрнасць,
– маліся за нас.
З'яднаны з Хрыстом, Адкупіцелем чалавека,
– маліся за нас.
Напоўнены Духам Святым, Панам і Жыватворцам,
– маліся за нас.
Цалкам адданы Марыі,
– маліся за нас.
Сябра святых і бласлаўлёных,
– маліся за нас.
Наступнік Пятра і Слуга слугаў Божых,
– маліся за нас.
Ахоўнік Касцёла, які навучае праўдам веры,
– маліся за нас.

Айцец Сабору і выканаўца яго пастановаў,
– маліся за нас.
Той, хто ўмацоўвае еднасць хрысціянаў і ўсяго роду людскога,
– маліся за нас.
Адданы шанавальнік Эўхарыстыі,
– маліся за нас.
Нястомны пілігрым гэтай зямлі,
– маліся за нас.
Місіянер усіх народаў,
– маліся за нас.
Сведка веры, надзеі і любові,
– маліся за нас.
Трывалы ўдзельнік Хрыстовых цярпенняў,
– маліся за нас.
Апостал паяднання і супакою,
– маліся за нас.
Натхняльнік цывілізацыі любові,
– маліся за нас.
Вястун Новай Евангелізацыі,
– маліся за нас.
Настаўнік, які заклікае выплысці на глыбіню,
– маліся за нас.
Настаўнік, які паказвае святасць як крытэрый жыцця,
– маліся за нас.
Папа Божай Міласэрнасці,
– маліся за нас.
Святар, які збірае Касцёл на складанне Ахвяры,
– маліся за нас.
Пастыр, які вядзе аўчарню да неба,
– маліся за нас.
Брат і настаўнік святароў,
– маліся за нас.
Айцец кансэкраваных асобаў,
– маліся за нас.
Апякун хрысціянскіх сем'яў,
– маліся за нас.
Падтрымка сужэнцаў,
– маліся за нас.
Абаронца ненароджаных,
– маліся за нас.
Апякун дзяцей, сіротаў і адзінокіх,
– маліся за нас.
Сябра і выхаваўца моладзі,
- маліся за нас.
Добры самаранін для церпячых,
– маліся за нас.
Дапамога людзям старэйшым і самотным,
– маліся за нас.

Вястун праўды аб годнасці чалавека,
– маліся за нас.
Чалавек малітвы, заглыблены ў Бога,
– маліся за нас.
Шанавальнік літургіі, які цэлебруе Ахвяру на алтарах свету,
– маліся за нас.
Увасабленне працавітасці,
– маліся за нас.
Той, хто палюбіў крыж Хрыста,
– маліся за нас.
Той, хто верна рэалізуе пакліканне,
– маліся за нас.
Трывалы ў цярпенні,
– маліся за нас.
Узор жыцця і памірання для Пана Бога,
– маліся за нас.
Той, хто павучае грэшнікаў,
– маліся за нас.
Той, хто паказвае дарогу заблуканым,
– маліся за нас.
Той, хто прабачае крыўдзіцелям,
– маліся за нас.
Той, хто паважае працiўнікаў і ганіцеляў,
– маліся за нас.
Заступнік і абаронца прыгнечаных,
– маліся за нас.
Той, хто падтрымлівае беспрацоўных,
– маліся за нас.
Той, хто клапоціцца пра бяздомных,
– маліся за нас.
Той, хто наведвае вязняў,
– маліся за нас.
Той, хто ўмацоўвае слабых,
– маліся за нас.
Той, хто вучыць усіх салідарнасці,
– маліся за нас.

Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету,
– даруй нам, Пане.
Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету,
– выслухай нас, Пане.
Баранку Божы, які бярэш на сябе грахі свету,
– змілуйся над намі.

С. : Маліся за нас, бласлаўлёны Ян Павел II.
Н. : Каб мы жыццём і словам абвяшчалі свету Хрыста, Адкупіцеля чалавека.

Молімся.
Міласэрны Божа, прымі падзяку за дар апостальскага жыцця і пасланніцтва бласлаўлёнага Яна